**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
**Першы прарэктар**
**УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”**
**____________________Ю.П.Бондар**
**“____” ____________________2012 г.**
**Рэгістрацыйны № ВД________/вуч**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбная праграма інтэграванага курса*

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ

*для магістраў па спецыяльнасці*
*1-23 80 01 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства*

Мінск 2012

**Складальнікі**

*С.А. Паўлава,* прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*Н.У. Клімянкова,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

*Н.Я. Петушка,* дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат педагагічных навук, дацэнт

*В.В. Нешытой,* прафесар, загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", доктар тэхнічных навук, прафесар

*Н.А. Лейко,* прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*Л.Г. Кірухіна,* намеснік дырэктара па навуковай рабоце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь

*А.І. Смолік,* доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 1 ад 17.09.2012 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № __ ад__.__2012 г.);

Адказны за рэдакцыю
Адказны за выпуск *С.А. Паўлава, Н.Я. Петушка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

"Актуальныя праблемы бібліятэчнай справы" адна з базавых дысцыплін бібліятэказнаўчага цыклу на другой ступені вышэйшай адукацыі, якая забяспечвае фундаментальную метадалагічную і агульнатэарэтычную базу падрыхтоўкі магістраў, здольных выконваць свае прафесійныя функцыі ў сферы навукі, адукацыі і культуры згодна сучасным патрабаванням.

Даследаванні праблемытыкі бібліятэчнай справы заўсёды з'яўляліся неад'емнай часткай бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства. Але на розных гістарычных этапах іх вырашэнне залежыць, па-першае, ад месца, якое бібліятэчная справа займае ў сучасным грамадскім развіцці; па-другое, станам, у якім знаходзіцца ассяроддзе бібліятэчнай справы. Істотным таксама з'яўляецца і тое, што бібліятэчная справа мае складаную структуру, кампаненты якой знаходзяцца ў складаным узаемадзеянні паміж сабою і іншымі формамі грамадскага жыцця. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае выкарыстанне сістэмнага падыхода да вызначэння і вывучэння праблематыкі бібліятэчнай справы. Ён дазваляе не толькі ўсебакова разглядзець праблему ў кантэксце тэарэтыка-метадалагічных падыходаў, але і пабудаваць практыку на гэтых асновах. Дадзеная пераемнасць з'яўляецца важным прынцыпам кіравання бібліятэчнай справы. Ва ўмовах глабалізацыі кіраванне бібліятэчнай справай набывае асаблівае значэнне. Па-першае, яно накіравана на вырашэнне такіх праблем, як:  арганізацыя такога доступу да бібліятэчных рэсурсаў, які задавальняў бы сучасныя інфармацыйныя запатрабаванні і веды карыстальнікаў; забеспячэнне раўнапраўнага доступу насельніцтва да бібліятэчных рэсурсаў на ўсіх узроўнях бібліятэчнага справы; павышэнне якасці бібліятэчнага абслугоўвання і дасягненне яго рэлевантнасці, г.зн. адпаведнасці запытам грамадства; павышэнне эфектыўнасці бібліятэчнага справы. Па-другое, эфектыўнасць кіравання бібліятэчнай справай залежыць ад ўжывання сучасных бібліятэчных тэхналогій, інавацыйных метадаў, станаўлення адпаведных арганізацыйных структур і форм у бібліятэцы, распрацоўкі і ўкаранення новых эканамічных механізмаў у дзейнасць бібліятэкі. Акрамя таго, сёння ні адна з'ява, што мае дачыненне да бібліятэчнай справы, не можа быць разгледжана без асноўнага суб'екта бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці – бібліятэкара-бібліёграфа. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае сістэматычнае і планамернае вывучэнне магістрантамі вышэйшай навучальнай установы фундаментальных праблем тэорыі бібліятэчнай справы.

Вучэбная праграма інтэграванага курса распрацавана на аснове кампетэнтнастнага падыходу, патрабаванняў да фарміравання кампетэнцый, сфармуляваных у адукацыйным  стандарце вышэйшай адукацыі Рэспублікі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь па спецыяльнасці 1-23 80 01 “Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства” (2012 г.).

Выкладанне дысцыпліны базіруецца ў першую чаргу на кампетэнцыях, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні наступных дысцыплін: абавязковай дысцыпліны сацыяльна-гуманітарнага цыклу – “Філасофія і метадалогія навукі; абавязковай дысцыпліны прыродазнаўчага цыклу –“Асновы інфармацыйных тэхналогій”; абавязковых дысцыплін агульнапрафесійнага цыклу – “Педагогіка і псіхалогія вышэйшай школы”; абавязковай спецыяльнай дысцыпліны “Тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства”. У сваю чаргу веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні дадзенага курса, з’яўляюцца асновай для засваення іншых спецыяльных дысцыплін, вывучэнне якіх прадугледжана адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі другой ступені.

*Мэтай інтэграванага курса* “Актуальныя праблемы бібліятэчнай справы” з'яўляецца авалоданне магістрантамі ведамі фундаментальных тэарэтычных і практычных праблем грамадскага карыстання бібліятэкай праз знаёмства з тэарэтычнымі і метадалагічнымі асновамі сучаснага бібліятэказнаўства, з навуковымі асновамі адзінай сістэмы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, з метадалогіяй сучасных сацыяльна-гуманітарных даследаванняў.

Мэтавая накіраванасць курса абумоўлівае вырашэнне наступных *задач*:

- навучанне спецыяльным ведам і ўменням ў нарматыўна-рэгулятыўных, змястоўных, прадметных, метадалагічных кірунках бібліятэчнай справы;
- авалодванне метадамі аналіза бібліятэказнаўчых праблем;
- спрыянне фарміраванню навукова-даследчай культуры, арганізацыйна-кіраўніцкай культуры і камунікатыўнай культуры магістрантаў.

У выніку засваення інтэграванага курса магістрант павінен *ведаць*:

- сутнасць тэорыі бібліятэчнай справы, яе змест, структуру, тэрмінасістэму;
- магчымасці і шляхі рэалізацыі ў практычнай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці розных канцэпцый;
- асноўныя метадалагічныя падыходы, якія выкарыстоўваюцца вучонымі для распрацоўцы навукова-практычных праблем бібліятэчнай справы (сістэмны, дзейнасны, семеатычны, педагагічны, навуковазнаўчы і інш.);
- сутнасць асноўных тэндэнцый развіцця бібліятэчнай справы у кантэксце глабалізацыйных працэсаў.

У выніку засваення інтэграванага курса магістранты павінны *ўмець*:

- выдзяляць у тэорыі бібліятэчнай справы праблемы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучасных кірункаў бібліятэчнай справы ў асяроддзі сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

– арганізоўваць і выконваць разнастайныя тэхналагічныя працэсы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, выкарыстоўваючы сучасныя дасягненні навукі і перадавых тэхналогій;

– валодаць тэхналогіяй ўкаранення сістэмы менеджменту якасці ў бібліятэцы;

– планаваць, арганізоўваць і праводзіць навуковыя даследаванні ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці на падставе выкарыстання агульнанавуковых і спецыяльных метадаў даследавання, вывучаць яе эфектыўнасць і якасць даследаванняў;

– валодаць педагагічнымі тэхналогіямі фарміравання інфармацыйнай культуры розных груп карыстальнікаў бібліятэк і інфармацыйных устаноў.

Выкладанне інтэграванага курса заснавана на эфектыўных педагагічных *методыках і тэхналогіях,* якія садзейнічаюць удзелу магістранта ў пошуку і кіраванні ведамі, набыццю вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач: тэхналогія праблемнага навучання; тэхналогія вучэбна-даследчай дзейнасці; праектная тэхналогія; камунікатыўная тэхналогія (дыскусія, прэс-канферэнцыя, вучэбныя дэбаты, круглы стол і інш.); метад аналізу вытворчых сітуацый, мадэліраванне рэальных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавую сістэму ацэнкі вучэбна-пазнавальнай і даследчай дзейнасці магістрантаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

Пры вывучэнні інтэграванага курса “Актуальныя праблемы бібліятэчнай справы” выкарыстоўваюцца наступныя формы (пазааўдыторная і аўдыторная, групавая і індывідуальная) і віды самастойнай работы:

– кантралюемая самастойная работа – выконванне заданняў у аўдыторыі ў час правядзення практычных заняткаў пад кантролем выкладчыка ў адпаведнасці з раскладам;

– кіруемая самастойная работа – выконванне індывідуальных (групавых) заданняў у пазааўдыторны час з кансультацыямі выкладчыка (падрыхтоўка рэфератаў па індывідуальных тэмах, аналіз пэўных сітуацый, наведванне бібліятэк і інш.).

Паспяховаму засваенню курса спрыяе ўключэнне заданняў па дысцыпліне ў праграму вытворчай практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інтэграваны курс “Актуальныя праблемы бібліятэчнай справы” уключае раздзелы: “Праблемы абслугоўвання ў тэорыі бібліятэчнай справы”, “Адлюстраванне праблем каталагізацыі і класіфікацыі”, “Матэматыка-статыстычныя метады ў бібліятэчнай дзейнасці”, “Тэарэтыка-метадычныя распрацоўкі праблем кіравання бібліятэчнай дзейнасцю”.

На вывучэнне інтэграванага курса “Актуальныя праблемы бібліятэчнай справы” вучэбным планам прадугледжана 54 гадзін аўдыторных заняткаў, з іх 34 лекцыйных, 20 семінарскіх/практычных заняткаў.

Вывучэнне курса рэкамендуецца завяршаць залікам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекц. | сем./ практ. зан. |
| **1** | **2** | **3** | **4** |
| Уводзіны | 1 | 1 | |
| **Раздзел 1. Праблемы абслугоўвання ў тэорыі бібліятэчнай справы** | | | |
| *Тэма 1.* Тэарэтычныя асновы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 2.* Псіхолага-педагагічныя ўмовы забеспячэння карыстальнікам бібліятэк адкрытага і бесперашкоднага доступу да інфармацыі і ведаў | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Інфармацыйныя патрэбнасці і інфармацыйныя паводзіны карыстальнікаў бібліятэк як прадмет сацыялагічнага даследавання | 2 | | 2 |
| *Тэма 4.* Бібліятэчныя зносіны як сацыяльна-псіхалагічны і псіхолага-педагагічны феномен: метадалагічныя асновы | 1 | 1 | |
| *Тэма 5.* Камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара як асноўная ўмова яго прафесійнай самарэалізацыі ў абслугоўванні карыстальнікаў | 2 | | 2 |
| **Раздзел 2. Адлюстраванне праблем каталагізацыі і класіфікацыі** | | | |
| *Тэма 6.* Асаблівасці складання бібліяграфічнага апісання для розных інфармацыйна-пошукавых масіваў | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Стандартызацыя бібліяграфічнага апісання дакументаў ва ўмовах аўтаматызацыі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Выкарыстанне класіфікацыйных і прадметызацыйных інфармацыйна-пошукавых моў (ІПМ) пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў | 2 | 2 | |
| *Тэма 9.* Сучасныя праблемы катагізацыі | 2 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| 1 | 2 | 3 | 4 |
|---|---|---|---|
| **Раздзел 3. Матэматыка-статыстычныя метады ў бібліятэчнай дзейнасці** | | | |
| *Тэма 10.* Асноўныя паняцці тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 11.* Пабудаванне абагульненых (універсальных) размеркаванняў. Нармальны закон размеркавання | 2 | 2 | |
| *Тэма 12.* Метады ацэньвання параметраў абагульненых размеркаванняў | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 13.* Рангавыя размеркаванні ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці | 2 | 2 | |
| **Раздзел 4. Тэарэтыка-метадалагічныя распрацоўкі праблем кіравання бібліятэчнай дзейнасцю** | | | |
| *Тэма 14.* Тэарэтычныя асновы менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці | 2 | 2 | |
| *Тэма 15.* Метадалогія стратэгічнага кіравання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю | 2 | 2 | |
| *Тэма 16.* Кадравы менеджмент у бібліятэцы | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 17.* Маркетынг ў бібліятэчнай дзейнасці: новыя падыходы і тэндэнцыі | 4 | 4 | |
| *Тэма 18.* Маркетынгавае падраздзяленне ў фармаванні камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі | 6 | 2 | 4 |
| **Разам ...** | **54** | **34** | **20** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### *Уводзіны*

Значэнне дысцыпліны "Актуальныя праблемы бібліятэчнай справы" ў працэсе падрыхтоўкі выкладчыкаў і даследчыкаў бібліятэказнаўчых праблем. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міжпрадметныя сувязі дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю.

## РАЗДЗЕЛ 1. ПРАБЛЕМЫ АБСЛУГОЎВАННЯ Ў ТЭОРЫІ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ

### *Тэма 1. Тэарэтычныя асновы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання*

Асноўныя канцэптуальныя падыходы да тэарэтычнага асэнсавання бібліятэчнага абслугоўвання. Іх эвалюцыя пад уплывам сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў і развіцця інфармацыйных тэхналогій. Інфармацыйны падыход. Камунікатыўны падыход. Псіхолага-педагагічны падыход. Сацыялізуючы падыход. Акмеялагічны падыход.

Бібліятэчная сацыялогія, бібліятэчная псіхалогія і бібліятэчная педагогіка як вынік інтэграцыйных працэсаў у асэнсаванні праблематыкі абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Узроўні інтэграцыі: метадалагічны, чалавеказнаўчы, метадычны. Іх рэалізацыя ў працэсе развіцця тэорыі абслугоўвання карыстальнікаў.

Тэорыя і тэхналогія чытацкага развіцця як тэарэтыка-метадычная база абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк.

### *Тэма 2. Псіхолага-педагагічныя ўмовы забеспячэння карыстальнікам бібліятэк адкрытага і беспярэшкоднага доступу да інфармацыі і ведаў*

Бібліятэчная педагогіка як спецыяльная галіна педагогікі, сфарміраваная на базе інтэграцыі з бібліятэказнаўствам, і як міждысцыплінарны раздзел бібліятэказнаўства, створаны на падставе яго сінтэза з педагогікай. Прадмет, задачы, прынцыпы і катэгорыі бібліятэчнай педагогікі.

Псіхолага-педагагічныя ўмовы ўдасканалення абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк. Бібліятэкар і карыстальнік як суб'екты абслугоўвання. Інфармацыйныя рэсурсы і паслугі як аб'ект, на які накіравана ўвага суб'ектаў абслугоўвання. Задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карыстальнікаў як прадмет псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння суб’ектаў абслугоўвання.

Вывучэнне сацыяльных, псіхалагічных і чытацкіх характарыстык карыстальнікаў бібліятэк як умова павышэння эфектыўнасці абслугоўвання. Камунікатыўная і прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкара як умова плённага псіхолага-педагагічнага ўзаемадзеяння з карыстальнікам. Роля ўнутранага і знешняга асяроддзя бібліятэкі ў рэалізацыі псіхолага-педагагічных задач абслугоўвання карыстальнікаў.

### *Тэма 3. Інфармацыйныя патрэбнасці і інфармацыйныя паводзіны карыстальнікаў бібліятэк як прадмет сацыялагічнага даследавання*

Уплыў эканамічных, сацыяльных, адукацыйных, навуковых, культурных накірункаў развіцця грамадства на тэорыю і практыку вывучэння карыстальнікаў бібліятэк. Роля сацыялогіі і псіхалогіі чытання ва ўмовах крызісу чытання.

Функцыі сацыялогіі чытання. Задачы сацыялогіі чытання. Вывучэнне карыстальніка як аснова абслугоўвання і сусветная прафесійная праблема. Развіццё сацыялогіі чытання на Беларусі: гісторыя і сучаснасць.

Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да сацыялагічных даследаванняў чытання. Метады збору першаснай сацыялагічнай інфармацыі і іх выкарыстанне ў сацыялогіі чытання. Сацыялагічныя, псіхалагічныя і педагагічныя метады ў даследаваннях чытання. Інструментарый даследавання і патрабаванні да яго. Комплекс інструментаў, неабходных і дастатковых для правядзення сацыялагічнага даследавання. Арганізацыя даследавання, аналіз і ўкараненне яго вынікаў.

### *Тэма 4. Бібліятэчныя зносіны як сацыяльна-псіхалагічны і псіхолага-педагагічны феномен: метадалагічныя асновы*

Сучасныя накірункі вывучэння бібліятэчных зносін. Спецыфіка прафесійных зносін бібліятэкара аддзела абслугоўвання. Паняцце “бібліятэчныя зносіны”. Спецыфіка бібліятэчных зносін у параўнанні з іншымі відамі зносін.

Праблемы камунікатыўнага ўзаемадзеяння бібліятэкара з чытачом у ходзе абслугоўвання. Бібліятэчны дыялог як адна з форм камунікацыі паміж бібліятэкарам і карыстальнікам. Умовы і прыёмы паляпшэння зносін бібліятэкара

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з чытачом у абслугоўванні. Выкарыстанне бібліяпсіхалагічных тэхналогій у бібліятэчным абслугоўванні. Кампенсаторная функцыя чытання і бібліятэрапія. Бібліятэрапія як накірунак бібліятэчнай педагогікі. Характар і напрамкі даследаванняў чытання асоб з абмежаванымі магчымасцямі і людзей, якія апынуліся ў цяжкіх жыццёвых умовах.

Арганізацыя чытацкіх зносін у публічнай бібліятэцы. Роля бібліятэкара ў арганізацыі чытацкіх зносін. Алгарытм дзейнасці бібліятэкара падчас арганізацыі чытацкіх зносін.

Бібліятэчная канфлікталогія і яе роля ў псіхолага-педагагічным забеспячэнні якаснага абслугоўвання карыстальнікаў.

### *Тэма 5. Камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара як асноўная ўмова яго прафесійнай самарэалізацыі ў абслугоуванні карыстальнікаў*

Чытацкая і камунікатыўная кампетэнтнасць бібліятэкара як прадумова прафесійнай самарэалізацыі. Змест паняцця “камунікатыўная культура бібліятэкара”. Кампетэнтнасць у зносінах і камунікатыўная культура. Роля і месца камунікатыўных якасцяў у прафесіяграме бібліятэкара аддзела абслугоўвання. Аптымальнае спалучэнне асобасных і прафесійных якасцяў бібліятэкара аддзела абслугоўвання.

Шляхі і спосабы фарміравання і ўдасканалення камунікатыўнай культуры бібліятэкара. Псіхалагічная карэкцыя бібліятэчных зносін. Сацыяльна-псіхалагічныя трэнінгі як сродак павышэння камунікатыўнай культуры. Дзелавыя і ралявыя гульні ў карэкцыі бібліятэчных зносін.

Бібліятэчная этыка аб камунікатыўнай культуры бібліятэкара. Этычныя правілы прафесійных паводзін і камунікатыўная культура бібліятэкара.

## РАЗДЗЕЛ 2. АДЛЮСТРАВАННЕ ПРАБЛЕМ КАТАЛАГІЗАЦЫІ І КЛАСІФІКАЦЫІ

### *Тэма 6. Асаблівасці складання бібліяграфічнага апісання для розных інфармацыйна-пошукавых масіваў*

Сферы выкарыстання бібліяграфічнага апісання дакументаў. Бібліяграфічнае апісанне дакументаў у бібліятэках. Віды бібліяграфічных запісаў. Загаловак, функцыі, віды, афармленне. Узаемасувязь аўтарскага загалоўка і звестак аб адказнасці.

Складанне бібліяграфічнага апісання ў бібліяграфічных, інфармацыйных, кнігагандлёвых дапаможніках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Афармленне бібліяграфічных спасылак.

Асаблівасці фарміравання бібліяграфічных запісаў пры стварэнні электроннага каталога (ЭК).

### *Тэма 7. Стандартызацыя бібліяграфічнага апісання дакументаў ва ўмовах аўтаматызацыі*

Уніфікацыя і стандартызацыя бібліяграфічнага апісання. Сістэма стандартаў і інструктыўна-нарматыўных матэрыялаў па бібліяграфічным апісанні і іх адаптацыя да Міжнароднага стандартнага бібліяграфічнага апісання.

Стандартызацыя тэрміналогіі бібліяграфічнага апісання. Выкарыстанне стандартаў у Беларусі.

Уздзеянне аўтаматызацыі на бібліяграфічнае апісанне. Камунікатыўныя фарматы. BELMARC. Беларускі камунікатыўны фармат прадстаўлення аўтарытэтных / нарматыўных запісаў у машыначытальнай форме BELMARC/AUTORITIES.

### *Тэма 8. Выкарыстанне класіфікацыйных і прадметызацыйных інфармацыйна-пошукавых моў (ІПМ) пры фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў*

Індэксаванне дакументаў. Асноўныя паняцці і тэрміны індэксавання: "прадметнае індэксаванне", "каардынатнае індэксаванне", "фактаграфічнае індэксаванне", "аўтаматызаванае індэксаванне".

Стандартызацыя індэксавання: МС ІСО 5963-85 "Документация - методы анализа документов, определения их тематики и выбора терминов индексирования", ГОСТ 7.59-2003 "Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации", ГОСТ 7.66-92 "Индексирование документов. Общие требования к координатному индексированию".

Праблемы выкарыстання класіфікацыйных і прадметызацыйных ІПМ ва ўмовах аўтаматызацыі.

### *Тэма 9. Сучасныя праблемы каталагізацыі*

Каталагізацыя дакументаў як аснова інфармацыйнага забеспячэння і абслугоўвання карыстальнікаў. Аўтаматызацыя каталагізацыйных працэсаў у Беларусі: стан і перспектывы. Рэтраканверсія каталогаў ў машыначытальную форму. Інфармацыйнае ўзаемадзеянне бібліятэк Беларусі і стварэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зводнага электроннага каталога (ЗЭК). Карпаратыўная каталагізацыя выданняў. Выкарыстанне Беларускага камунікатыўнага фармата прадстаўлення бібліяграфічных запісаў у машыначытальный форме BELMARC і Беларускага камунікатыўнага фармата прадстаўлення аўтырытэтных запісаў BELMARC у машыначытальный форме BELMARC/AUTORITIES.

## РАЗДЗЕЛ 3. МАТЭМАТЫКА-СТАТЫСТЫЧНЫЯ МЕТАДЫ Ў БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### *Тэма 10. Асноўныя паняцці тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі*

Выпадковыя падзеі. Віды выпадковых падзей. Асноўныя тэарэмы тэорыі імавернасцей. Тэарэма складання імавернасцей (несумесных падзей). Тэарэма множання імавернасцей (незалежных падзей).

Выпадковыя велічыні і іх законы размеркавання. Віды выпадковых велічынь (непарыўныя, дыскрэтныя). Паняцце закона размеркавання. Функцыя размеркавання. Шчыльнасць размеркавання, яе ўласцівасці.

Генеральная і выбаркавая сукупнасці. Просты статыстычны рад. Ранжыраваны рад. Інтэрвальны рад размеркавання. Парадак пабудовы гістаграмы.

Лічбавыя характарыстыкі выпадковых велічынь. Паказчыкі становішча: мода, медыяна, матэматычнае чаканне. Паказчыкі рассейвання: дысперсія, сярэдняе квадратовае адхіленне, каэфіцыент варыацыі і іх уласцівасці. Моманты (пачатковыя, цэнтральныя). Паказчыкі асіметрыі і эксцэса.

### *Тэма 11. Пабудаванне абагульненых (універсальных) размеркаванняў. Нармальны закон размеркавання*

Метады пабудавання абагульненых размеркаванняў (метад К. Пірсана, метад абагульнення). Тры сістэмы непарыўных размеркаванняў В. Нешытога. Размеркаванні груп А і Б. Класіфікацыя размеркаванняў. Вылічэнні нармаванага множніка. Размеркаванні функцый выпадковых аргументаў.

Нармальны закон размеркавання. Правіла "трох сігма". Давяральная імавернасць і давяральны інтэрвал. Кропкавая і інтэрвальная адзнакі матэматычнага чакання выпадковай велічыні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 12. Метады ацэньвання параметраў абагульненых размеркаванняў*

Метад найменшых квадратаў. Метад найбольшага праўдападабенства. Класічны і універсальны метады момантаў.

Крытэрыі для ўстанаўлення тыпу раўнаванай крывой па метаду момантаў. Выкарыстанне номаграмы.

*Тэма 13. Рангавыя размеркаванні ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

Форма прадстаўлення рангавых размеркаванняў.

Крытэрый аднароднасці рангавых размеркаванняў, выдзяленне неаднароднай часткі.

Універсальныя законы рассейвання і старэння публікацый.

Закон рассейвання публікацый (у сэнсе Брэдфарда) як вынік уласціваснцей універсальнага закона.

Месца закона Ціпфа ў сямействе рангавых размеркаванняў.

## РАЗДЗЕЛ 4. ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДЫЧНЫЯ РАСПРАЦОЎКІ ПРАБЛЕМ КІРАВАННЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ

*Тэма 14. Тэарэтычныя асновы менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*

Тэарэтычныя канцэпцыі вядучых заходніх школ у кіраванні. Выкарыстанне канцэпцый менеджменту ў рэфарміраванні кіравання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю ў Беларусі. Этапы фарміравання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю. Уклад айчыных і расійскіх бібліятэказнаўцаў у фарміраванне асноў менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю.

Фарміраванне канцэпцыі бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту. Асноўныя палажэнні старай і новай парадыгмы кіравання метадалогіяй інавацыйных падыходаў да кіравання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю. Дыверсіфікацыя менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Характарыстыка класіфікацыі і тыпалагічны аналіз бібліятэчна-інфармацыйнага менеджменту.

Бібліятэка як арганізацыя. Канцэпцыя арганізацыйнага развіцця бібліятэкі. Праяўленне законаў развіцця, сінергіі, самазахавання ў дзейнасці бібліятэкі. Улік асноўных законаў і законаў другога ўзроўню ў кіраванні бібліятэкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метадалагічныя падыходы да пераўтварэння бібліятэкі на аснове менеджменту якасці. Характарыстыка (стандарт ИСО 8402) сучаснай канцэпцыі ўсеагульнага кіравання якасцю ў бібліятэцы. Асноўныя палажэнні новай мадэлі кіравання якасцю бібліятэчнай дзейнасці (роля кіраўніцтва, стратэгічнае планаванне, уцягненне ўсіх супрацоўнікаў, падрыхтоўка персанала, сістэма матывацыі, распрацоўка бібліятэчнай прадукцыі і паслуг, кіраванне працэсам).

Выкарыстанне прынцыпаў менеджменту якасці ў рэарганізацыі дзейнасці бібліятэк (арыентацыя на спажыўца; лідэрства кіраўніка; уцягненне работнікаў; працэсны падыход; сістэмны падыход, прыняцце рашэнняў, заснаваных на фактах; узаемавыгадныя адносіны з партнёрамі).

Методыка правядзення самаацэнкі па якасці дзейнасці бібліятэкі і яе паслуг.

### *Тэма 15. Метадалогія стратэгічнага кіравання бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасцю*

Канцэпцыя і этапы стратэгічнага кіравання. Уклад у распрацоўку структуры і мадэлі стратэгічнага кіравання заходніх навукоўцаў: Ф. Абрамса, Г. Хмеля, Г. Саймана, І. Ансоффа і інш.

Характарыстыка храналагічнай класіфікацыі парадыгмальнай пазіцыі станаўлення і развіцця стратэгічнага кіравання (І. Ансофф, Г. Мінцберг, Б. Альстрэнд, Дж. Лэмпел).

Распрацоўка стратэгічных накірункаў развіцця бібліятэкі. Асновы кіравання праектамі ў бібліятэчнай справе. Сутнасныя характарыстыкі кіравання праектамі ў працах В.Н. Варапаева, В.В. Іванова, І.І. Мазура, В.Д. Шапіра і інш. Прынцыпы праграміравання ў сацыяльна-культурным асяроддзі. Значнасць выкарыстання метадалогіі кіравання праектамі ў бібліятэчнай сферы.

### *Тэма 16. Кадравы менеджмент у бібліятэцы*

Канцэпцыя і сістэма персанал-стратэгіі бібліятэкі. Тэндэнцыі ў развіцці функцыянальных асаблівасцей персанал-стратэгіі і іх ўплыў на прыярытэты кадравай палітыкі. Этапы стратэгічнага кіравання персаналам.

Матывацыя і стымуляванне персанала. Падыходы да вызначэння паняццеў “матывацыя”, “стымуліраванне”, іх змест і характарыстыка. Эвалюцыя канцэпцыі матывацыі. Змястоўныя і працэсуальныя тэорыі матывацыі работнікаў. Сучасныя тэорыі матывацыі і магчымасці іх выкарыстання ў кіраванні персаналам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метадалогія ацэнкі персанала. Падыходы да вызначэння паняцця “ацэнка персанала”. Задачы ацэнкі персанала. Сістэма ацэнкі персанала. Паказчыкі і методыкі дзелавой ацэнкі персанала – інструмент развіцця персанала.

### *Тэма 17. Маркетынг у сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці: сучасныя падыходы і тэндэнцыі*

Асноўныя канцэптуальныя падыходы да тэарэтычнага асэнсавання маркетынга ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Іх эвалюцыя пад уплывам палітыка-эканамічных і сацыяльна-культурных пераўтварэнняў і развіцця інфармацыйных тэхналогій. Глабалізацыя і персаналізацыя як вынік інтэграцыйных працэсаў у асэнсаванні маркетынга як крыніцы інавацыйных падыходаў у бібліятэчнай практыцы.

### *Тэма 18. Маркетынгавае падраздзяленне ў фармаванні камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі*

Мэты фармавання камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі. Арганізацыйная культура як аснова камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі. Агульныя прынцыпы фармавання камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі. Рэалізацыя ўнутранай камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі. Скіраванасць унутранай камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі. Сродкі ўнутранай камунікацыйнай палітыкі (унутрыфірменныя газеты і часопісы, распаўсюджванне аб'яў і збор прапаноў супрацоўнікаў, вытворчыя нарады, навучанне супрацоўнікаў, святы і інш.).

Рэалізацыя знешняй камунікацыйнай палітыкі бібліятэкі. Знешняя камунікацыйная палітыка ў фармаванні неадчувальных актываў бібліятэкі. Удзел маркетынгавага падраздзялення ў рэкламнай дзейнасці бібліятэкі. Арганізацыя выставачнай дзейнасці бібліятэкі. PR-дзейнасць бібліятэкі. Інфармацыйнае суправаджэнне конкурсных праектаў. Інфармацыйная падтрымка дзелавых перамоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

*Асноўная літаратура*

1. *Аб інфарматызацыі*: Закон Рэсп. Беларусь : прыняты 6 верас. 1995 г., № 3850 – XII [Тэкст] // Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэсп. Беларусь. – 1995. – № 33. – С. 3–16.

2. *Аб культуры* ў Беларускай ССР : Закон Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі : прыняты 4 чэрвеня 1991 г. [Тэкст] // Бібліятэчная справа Рэспублікі Беларусь : даведнік / БУК, ЦНБ АН Беларусі; Склад. Р.С. Матульскі. – Мінск, 1995. – С. 8–27.

3. *Аб унясенні* змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь" [Тэкст] : закон Рэспублікі Беларусь : прыняты 3 кастр. 2002 г. – Мінск, 2002. – 18 с.

4. *Авдулова, Т.П.* Психологические аспекты менеджмента: учебно-методическое пособие [Текст] / Т.П.Авдулова.– Москва: Либерия-Бибинформ, 2005.– 154с.

5. *Белорусский коммуникативный формат представления авторитетных* / нормативных записей в машиночитаемой форме (BELMARC / AUTHORITIES) – http: // opac/ bas–net. by/marc–doc/belmarc–99/Authorities.zip. – электронный ресурс.

6. *Беспалов, В.М.* Психология чтения : учебное пособие для вузов культуры и искусств [Текст] / В.М.Беспалов. – Москва: МГУКИ, 2007. – 198 с.

7. *Библиопсихология и библиотерапия* [Текст] / Ред. Н.С.Лейтес, Н.Л.Карпова, О.Л.Кабачек. – Москва: Школьная библиотека, 2005. – 480 с.

8. *Библиотечная энциклопедия* [Текст] / Рос. гос. б–ка. – Москва: Пашков дом, 2007. – 1080 с.

9. *Бородина, В.А.* Теория и технология читательского развития в отечественном библиотековедении : научные и методические основы [Текст] / В.А. Бородина. – Москва: Школьная библиотека, 2006. – 335 с.

10. *Брежнева, В.В.* Информационное обслуживание : продукты и услуги, предоставляемые библиотеками и службами информации предприятий [Текст] / В. В. Брежнева, В. А. Минкина; СПбГУКИ. – 2–е изд., перераб. – Санкт-Петербург: Профессия, 2006. – 304 с. – (Библиотека).

11. *Ванеев, А. Н.* Библиотечное дело. Теория. Методика. Практика [Текст] / А. Н. Ванеев; СПбГУКИ. – Санкт-Петербург: Профессия, 2004. – 368 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. *Васильев, И.Г.* и др. Социологические исследования в библиотеках: практич. пособие [Текст] / И.Г. Васильев, М.Е. Илле, Д.К. Раввинский. – Санкт-Петербург: Профессия, 2003. – 176 с. – (Библиотечный практикум).
13. *Вершинин, М.И.* Электронный каталог : проблемы и решения [Текст] / М.И. Вершинин .– Санкт-Петербург: Профессия, 2007 .– 232 с.
14. *Горшков, Ю.А.* Введение в политэкономию библиотечно–информационной деятельности : монография [Текст] / Ю.А.Горшков; Российская государственная библиотека, Научно-исследовательский отдел библиотековедения. – Москва: Пашков дом, 2004. – 222, [1] с. – (Библиотека: новые возможности).
15. *ГОСТ 7.59–2003. Индексирование документов*. Общие требования к систематизации и предметизации. – Взамен ГОСТ 7.59–90; введ. 2004.–01–01. [Текст] – Москва, 2003. – 5 с.
16. *ГОСТ 7.1–2003. Библиографическая запись.* Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення.– Взамен ГОСТ 7.1–84, ГОСТ 7.16–79, ГОСТ 7.18–79, ГОСТ 7.34–81, ГОСТ 7.40–82; введ. 2004–11–01. [Текст] – Мінск, 2004.–48 с.
17. *ГОСТ 7.80–2000. Библиографическая запись*. Заголовок. Общие требования и правила составления. – Введ. 2001–11–01. [Текст] – Минск, 2001. – 8 с.
18. *ГОСТ 7.82–2001. Библиографическая запись*. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне электронных рэсурсаў. Агульныя патрабаванні і правілы складання. – Введ. 2003–01–01. [Текст] – Мінск, 2002. – 23с.
19. *Дубровина, Л.А.* Руководство по организации самооценки внутрибиблиотечных систем обеспечения качества деятельности и услуг : метод. пособие [Текст] / Л.А.Дубровина, А.И.Кочетков. – Москва : Либерия, 2004. – 120с.
20. *Езова, С.А*. Библиотечное общение как феномен исследования : монография [Текст] / С.А.Езова. – Москва : Либерея-Бибинформ, 2007. – С. 3–13.
21. *Зыгмантовіч, С.В.* Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі : вучэб. дап. [Тэкст] / С.В. Зыгмантовіч. – Мн.: Бел. дзярж. ўн-т культуры і мастацтваў, 2009. – 124 с.
22. *Ильина, С.В.* Авторитетные/нормативные записи в АБИС : учеб. пособие для студентов вузов по специальности 1–23 01 11 Библиотековедение и библиография (по направления) [Текст] / С.В. Ильина.– Минск : БГУКИ, 2012.– 97 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

23. *Ильяева, И. А.* Стратегическое управление библиотекой : учеб.-метод. пособие [Текст] / И.А. Ильяева, В.Н. Маркова. – Москва : КНОРУС, 2008. – 184с.
24. *Каспарова, Н.Н.* Нормативно–методическая база и проблемы каталогизации электронных ресурсов [Текст] / Н.Н. Каспарова // Библиотековедение. – 2002. – № 2. – С. 50–53.
25. *Клименкова, Н.В.* Библиотерапия как направление библиотечной педагогики [Текст] / Н.В. Клименкова // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці : матэрыялы навукова–практычнай канферэнцыі (21–22 кастр.2009 г.) – Мінск, 2010. – С. 32–38.
26. *Клімянкова, Н.У.* Бібліятэчна–педагагічная дзейнасць : накірункі і перспектывы развіцця [Тэкст] / Н.У.Клімянкова // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 12. – С. 44–49.
27. *Клімянкова, Н.У.* Бібліятэчная канфліктaлогія ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста інфармацыйна–дакументнай сферы [Тэкст] / Клімянкова Н.У. // Роль библиотек и информации в устойчивом развитии общества : материалы Междунар. научно–практ. конф., Минск, 25–27 окт. 2005 г. – Минск : "Красико–Принт", 2006. – С. 78–83.
28. *Клімянкова, Н.У.* Сацыялогія чытання на Беларусі : гісторыя і сучаснасць [Тэкст] / Н.У.Клімянкова // Веснік Віцебскага дзяржаўнага універсітэта. – 2008. – № 3. – С. 149–153.
29. *Колесникова, М.Н.* Менеджмент библиотечно-информационной деятельности : учеб. для вузов [Текст] / М.Н. Колесникова. – Москва : Либерия-Бибинформ, 2009. – 256 с.
30. *Ляйко, Н.А.* Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" [Тэкст] / Н.А.Ляйко, А.І. Фядорына. – Мінск, 2006. – С. 154–170.
31. *Матлина, С.Г.* Публичная библиотека : пути инновационного развития : избр. [Текст] / С.Г. Матлина. – Санкт-Петербург : Профессия, 2009. – 376с.
32. *Мейжис, И.А.* Социально–психологические основы библиотечного обслуживания : учеб. пособие [Текст] / И.А. Мейжис. – Николаев, 1994. – 192с.
33. *Нешитой В.В.* Математико-статистические методы анализа в библиотечно–информационной деятельности : учеб.-метод. пособие [Текст] / В.В. Нешитой. – Минск : БГУ культуры и искусств, 2009. – 203с.
34. *Нешитой В.В.* Универсальные законы рассеяния и старения публикаций [Текст] / В.В. Нешитой // Веснік Бел. дзярж. ўн-та культуры і мастацтваў. – 2007. – №8. – С. 128 – 133.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

35. *Нешитой, В.В.* Форма представления ранговых распределений [Текст] / В.В. Нешитой // Учёные записки Тартуского гос. ун–та. – 1987. – Вып. 774. – С. 123 – 134.
36. *Петушко, Н.Е.* Библиотечный маркетинг: учеб.-метод. пособие [Текст] / Н.Е. Петушко. – Минск : Бел. гос. Ун-т культуры и искусств, 2010. – 116 с.
37. *Пилко, И. С.* Информационные и библиотечные технологии : учеб. пособие [Текст] / И.С. Пилко. – Санкт-Петербург : Профессия, 2006. – 342 с. (Библиотека).
38. *Ракавецкая, Л.І.* Менеджмент у бібліятэчнай справе (тэхналагічны менеджмент) : вучэб. дапам. [Тэкст] / Л.І. Ракавецкая. – Мінск : Бел. дзярж. ўн-т культуры і мастацтваў, 2010. – 252 с.
39. *Российское* библиотековедение : XX век. Направление, проблемы и итоги : опыт монографического исследования [Текст] / Рос. гос. б-ка; сост. и предисл. Ю.П. Мелентьевой; науч. ред. Л.М.Инькова. – Москва : ФАИР-ПРЕСС, Пашков дом, 2003. – 432 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).
40. *Рубакин, Н.А.* Психология читателя и книги : краткое введение в библиологическую психологию [Текст] / Н.А. Рубакин. – Москва : Книга. – 1977. – 264 с.
41. *Справочник библиотекаря* [Текст] / науч. ред. А.Н. Ванеев, В.А. Минкина. – Санкт-Петербург : Профессия, 2001. – 448 с. (Библиотека).
42. *Справочник* информационного работника [Текст] / науч. ред. Р.С. Гиляревский, В.А. Минкина. – Санкт-Петербург : Профессия, 2005. – 552с. – (Библиотека).
43. *СТБ ГОСТ 7.76–2004. Камплектаванне фонду дакументаў.* Бібліяграфаванне. Каталагізацыя. Тэрміны і азначэнні = Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения. – Уведз. 2005–03–01. [Тэкст] – Мінск, 2004. – 47 с.
44. *Сукиасян, Э.Р.* Каталогизация и классификация. Электронные каталоги и автоматизированные библиотечные системы : избранные статьи [Текст] / Э.Р. Сукиасян. – Санкт-Петербург : Профессия, 2009. – 536 с.
45. *Суслова, И.М.* Менеджмент библиотечно-информационной деятельности : [управление развитием библиотек, менеджмент качества библиотечно-информационной деятельности, организация управления библиотекой, библиотечный маркетинг] : учебник для вузов культуры и искусств [Текст] / И. М. Суслова, В. К. Клюев; Московский государственный университет культуры и искусств. – Санкт-Петербург : Профессия, 2010. – 600 с. (Библиотека).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая літаратура*


1. *Ахмадова, Ю.А.* Менеджмент качества и библиотека: учебно-практ. пособие [Текст] / Ю.А. Ахмадова, Е.Я. Галимова. – Москва : Либерия-Бибинформ. – 2007. – 88 с.
2. *Борисова, О.О.* Рекламно-информационные технологии библиотечной деятельности : учеб.-практ. пособие [Текст] / О.О. Борисова; Орловский гос. ин–т искусств и культуры. – Санкт-Петербург : Профессия, 2006. – 320с.
3. *Вентцель, Е.С.* Теория вероятностей [Текст] / Е.С. Вентцель. – Могсква : Физматгиз, 1969. – 576 с.
4. *Галимова, Е.Я.* Библиотечный сервис : учеб.-метод. пособие [Текст] / Е.Я. Галимова. – Москва : Либерея-Бибинформ, 2006. – 142 с. – (Библиотекарь и время. XXI век).
5. *Галимова, Е.Я.* Критерии эффективности организационного управления библиотекой [Текст] / Е.Я. Галимова // Библиотековедение. – 2006.– № 4. – С. 33–39.
6. *Галковская Ю.Н.* Правовое обеспечение деятельности библиотек в Республике Беларусь : научно-практ. пособие [Текст] / Ю.Н. Галковская. – Минск : Новое знание. – 2008. – 215 с.: ил.
7. *Гмурман, В.Е.* Теория вероятностей и математическая статистика [Текст] / В.Е. Гмурман. – Москва : Высшая школа, 1977. – 479 с.
8. *Горшков, Ю.А.* Библиотека в стратегии экономического роста книгоиздания [Текст] / Ю.А. Горшков. – Москва : Пашков дом, 2007. – 328 с. – (Библиотека: новые возможности).
9. *Дворкина, М.Я.* Библиотечное обслуживание : новая реальность : лекции [Текст] / М.Я. Дворкина; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – Москва : Изд–во МГУКИ–Профиздат, 2003. – 44 с. – (Современная библиотека).
10. *Дригайло, В.Г.* Основы научной организации труда в библиотеке : учебно-методическое пособие [Текст] / В.Г. Дригайло.– Москва : Либерия-Бибинформ, 2005. – 424с.
11. *Дубровина, Л.А.* Модернизация библиотек на основе менеджмента качества : учеб.-метод. пособие [Текст] / Л.А.Дубровина, А.И.Кочетков. – М., 2004. – 84 с.
12. *Дыченко, Л.Ф.* Психология и библиотекарь : учебно-практ. пособие [Текст] / Л.Ф.Дыченко. – Москва : Либерия-Бибинформ, 2006. – 143 с.
13. *Зыгмантовіч, С.В.* Персанал бібліятэкі і пытанні кадравай палітыкі бібліятэкі [Тэкст] / С.В. Зыгмантовіч // Бібліятэчны свет. – 2006. – № 1. – С. 12–16.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Зыгмантович, С.В.* Подготовка библиографической продукции библиотеками : науч.–практ. пособие [Текст] / С.В. Зыгмантович. – Минск : Новое знание, 2009. – С. 168–176. – (Профессионалам библиотечного дела).
15. *Инновации в библиотеках :* сборник статей [Текст] / Российская гос.б-ка, научно-исслед.отд.библиотековедения; [сост. М.Я.Дворкина, Е.Н.Гусева]. – Москва : Пашков дом, 2010. – 132с. – (Библиотека: новые возможности).
16. *Кабачек, О.Л.* Этико-психологические проблемы библиотечного общения [Текст] / О.Л. Кабачек // Библиотечное обслуживание на рубеже XX1 века : проблемы и перспективы : мат. научно-практ. конф. – Санкт-Петербург, 2002. – С.126–127.
17. *Каптерев, А.И.* Менеджмент знаний : от теории к технологиям: науч.-метод. пособие [Текст] / А.И. Каптерев. – Москва : Либерия-Бибинформ, 2005. – 296 с.
18. *Колегаева, С.Д.* Экономизация библиотечной сферы : терминологическое осмысление [Текст] / С.Д. Колегаева // Библиотечное дело – XXI век : науч.-практ. сб.: вып. 2 (16)'2008 / Рос. гос. б-ка. – Москва, 2008. – С.171–179. – Прил. к журн. "Библиотековедение".
19. *Комиссарова, Л.Д.* Социально-психологические технологии в работе современной публичной библиотеки : методическое пособие [Текст] / Л.Д. Комиссарова. – Москва : Либерия, 2003. – 150с.
20. *Манукян, Л.И.* Коммуникативная компетентность библиотекаря : подходы к уточнению понятия [Текст] / Л.И.Манукян // Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці : мат.навукова–практ.канф. (21–22 кастр. 2009 г.). – Мінск, 2010. – С. 222–227.
21. *Маркетинг* как технология управления современной библиотекой : науч.-практ. пособие [Текст] / И. Н. Басамыгина, А. А. Апанасенко. – Москва : Литера, 2009. – 128 с. – (Современная библиотека).
22. *Меньщикова, С.П.* Современные критерии и показатели оценки качества библиотечной деятельности : практическое пособие [Текст] / С.П. Меньщикова. – Москва : Литера, 2009. – 112 с. – (Современная библиотека; вып. 48).
23. *Митчел, Д.* Десятичная классификация Дьюи : средство ориентации знаний для XXI века [Текст] / Д. Митчел // Научно и технические библиотеки. – 1999. – № 6. – С. 58–65.
24. *Мотульский, Р.С.* Библиотека как социальный институт [Текст] / Р.С. Мотульский. – Минск : Бел. гос. ун-т культуры, 2002. – 374 с.
25. *Переверзева, Ю.А.* Фінансава-эканамічная дзейнасць бібліятэк: вучэб.–метад. дапам. [Тэкст] /Ю.А. Пераверзева. – Мінск : Бел. дзярж. ўн-т культуры і мастацтваў, 2009. – 114 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

26. *Руководство ИФЛА по работе публичных библиотек* : [перевод с английского] [Текст] / Международная Федерация библиотечных ассоциаций и учреждений, Российская библиотечная ассоциация; составители издания на английском языке: Кристи Кунц и Барбара Габбин; [научный редактор В. Р. Фирсов]. – Санкт-Петербург : Российская национальная библиотека, 2011. – 183 с. – (Публикации ИФЛА).
27. *Создание электронных каталогов* : из опыта работы Российской государственной библиотеки [Текст] / РГБ; сост. О.А. Лавренова. – Москва, 1996. – 80 с.
28. *Суслова, И.М.* Библиотека в системе некоммерческого маркетинга : учеб.-метод. пособие [Текст] / И.М. Суслова. – Москва : Профиздат, 2003. – 175 с. – (Современная библиотека).
29. *Суслова, И.М.* Менеджер библиотеки : требования к профессии и личности : учебное пособие для вузов и колледжей культуры и искусств [Текст] / И.М.Суслова. – Москва : Изд-во МГУКИ, ИПО Профиздат, 2000. – 144с.
30. *Суслова, И. М.* Практический маркетинг в библиотеках : учеб.-метод. пособие [Текст] / И. М. Суслова. – Москва : Либерея, 2004. – Вып. 9. – 144 с. – (Библиотекарь и время. XXI век).
31. *Управление* библиотекой : учеб.-практ. пособие [Текст] / А.С. Аверьянов, А.Н.Ванеев, В.Г.Горев [и др.]. – Санкт-Петербург : Профессия, 2002. – 302с. – (Библиотека).
32. *Шереметьева, А.А.* Система корпоративной каталогизации и ведения сводного электронного каталога Беларуси : организационно-технологические аспекты [Текст] / А.А. Шереметьева, С.А. Кремезная // «Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса : материалы VI международных книговедческих чтений (Минск, 27–29 окт. 2010 г.) / сост. Л.Г. Кирюхина; науч. ред. Р.С. Мотульский .– Минск, 2010.– С. 318–323.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

*Вучэбная праграма інтэграванага курса*

**АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ**

*для магістраў па спецыяльнасці*
*1-23 80 01 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства*

*Карэктар*

*Тэхнічны рэдактар*

Падпісана ў друк 2012г. Фармат 60×84 1/16.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. .
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2012 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ